**ВАРВА́РА**, прысвятак у *народным календары*; дзень хрысціянскай пакутніцы (17 снежня н.ст.), які лічыўся жаночым святам. На В. забаранялася прасці кудзелю, бо святая была замучана верацёнамі. Каб скаціна добра вялася, пяклі пірагі з макам, а таксама выпякалі з цеста галовы, рогі, ногі, капыты, вушы, якімі кармілі свойскую жывёлу. Пасля В. дзень паступова пачынаў расці («Варвара ночы ўварвала, а дня прытачыла»). У метэаралагічных назіраннях дзень В. звязваўся з інш. суседнімі прысвяткамі: «Варвара мосціць, Сава цвяхі вострыць, а Мікола прыбівае», «Варвара заварыць, а Сава паправіць, а Мікола гвоздам заб'е». Добрае надвор'е на В. прадказвала добры ўраджай лёну на наступнае лета.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 558—559.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ